■ Заробкі

# У ПЛЮСЕ ВЫДАЎЦЫ І КУР'ЕРЫ



## Хто за год стаў атрымліваць больш?

**Намінальна налічаная сярэднямесячная заработная плата беларусаў цяпер складае 6,6 мільёна рублёў. У прамысловасці яна раўняецца сямі мільёнам, у будаўніцтве — 6,8 мільёна, у сельскай, лясной і рыбнай гаспадарцы — 4,4 мільёна.**

Па 6,3 мільёна маюць прадаўцы, па 11,3 — фінансісты і страхоўшчыкі. Тыя, хто працуе ў сферы творчасці, спорту і забаў, атрымліваюць 5,3 мільёна, у турызме — 4,9. У сферы аховы здароўя і сацыяльных паслуг сярэдні даход складае 5,4 мільёна, у адукацыі — амаль пяць мільёнаў.

Калі казаць пра рэальныя заробкі, то ў большасці галін яны меншыя за мінулагоднія. Выключэнне — транспартная, выдавецкая, паштовая і кур'ерская дзейнасці. На некалькі працэнтаў павысіўся таксама даход спецыялістаў, занятых вытворчасцю вылічальнай, электроннай і аптычнай апаратуры, і навукоўцаў.

Як адзначаюць у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, сёння асноўная задача наймальніка — распрацаваць механізм матэрыяльнага стымулявання, каб скіраваць работнікаў на дасягненне высокіх вынікаў. Бо без росту прадукцыйнасці працы заробкі не падымуцца.

— Заканадаўства прадастаўляе права камерцыйным арганізацыям самастойна (на падставе лакальных нарматыўных прававых актаў) выбіраць любыя сістэмы аплаты працы, вызначаць складнікі заробку і іх памеры з улікам іх фінансавых магчымасцяў, спецыфікі і асаблівасцяў эканамічнай дзейнасці, — падкрэслівaюць у ведамстве.

За год колькасць наймальнікаў, якія прымяняюць гібкія сістэмы аплаты працы вырасла з 8,5 да 10 тысяч (сем працэнтаў ад усіх камерцыйных арганізацый у краіне). Каб заахвоціць да гэтага падыходу іншыя прадпрыемствы, міністэрства рэгулярна праводзіць семінары, «круглыя сталы» і інфалініі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■ БСЖ — 25

# БАНКІРЫ З ДОБРЫМ СЭРЦАМ

**У Мінску адбылася сустрэча структурнага падраздзялення Беларускага саюза жанчын Беларусбанка. Сёння ў банкаўскай «пярвічцы» больш за 10 тысяч актыўных і мэтанакіраваных прыгажунь. Яе актыў сабраўся за адным сталом для абмеркавання важных пытанняў.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

За круглым сталом гучалі прапановы аб сацыяльным партнёрстве і ўмацаванні ўзаемадзеяння пярвічнай арганізацыі Беларусбанка з гарадскімі, раённымі і абласнымі саветамі жанчын.

Ірына Аляксанава, старшыня Мінскага гарадскога аб'яднання БСЖ, ідэю падтрымала з вялікім энтузіязмам.

— У арганізацыі банка шмат крэатыўных і маладых жанчын. Мы будзем актыўна супрацоўнічаць. Сёння правесці вялікае мерапрыемства не кожнаму пад сілу, а вось агульнымі намаганнямі — іншая справа. Пачатак ужо пакладзены. Мы збіраліся і правялі некалькі выязных пасяджэнняў, наведвалі аб'екты сацыяльнай сферы Мінска.

У найбліжэйшых планах — зладзіць агульнае мерапрыемства да Дня Перамогі.

Паўнамоцтвы старшыні «пярвічкі» Беларусбанка перайшлі ад Наталлі Петрачковай да Марыны Лянчэўскай. Ужо ў новай ролі старшыня шчыра падзякавала жанчынам за давер і добрыя словы. Прыйшла павіншаваць сяброўку і намесніца старшыні БСЖ Надзея Ермакова:

— Перад маладымі, мэтанакіраванымі і крэатыўнымі спецыялістамі адчынены ўсе дзверы. Упэўнена, змены дадуць станоўчы вынік.

**Хрысціна ХІЛЬКО**

■ Падзея

# З Вялікабрытаніі вярнулася кніга Скарыны

## Праўда, пакуль толькі яе лічбавая копія



**Пры падтрымцы Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь і пасольства нашай краіны ў Аб'яднаным Каралеўстве Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі ў Мінск, у Нацыянальную бібліятэку Беларусі з брытанскага Кембрыджа перададзена лічбавая копія ўнікальнай скарынаўскай «Першай кнігі Царстваў».**

Выданне, надрукаванае ў Празе ў 1518 годзе, захоўваецца ў Кембрыджы, у бібліятэцы Траецкага каледжа. Экзэмпляр не поўны, гэта фрагмент кнігі, але сёння кожная старонка, кожнае слова беларускага асветніка — нацыянальная святыня для беларусаў.

— Гэта акцыя стала вынікам доўгіх перамоў, што адбываліся падчас майго леташняга візіту ў Аб'яднанае Каралеўства, а таксама надзвычай актыўнай дзейнасці беларускага афіцыйнага прадстаўніцтва ў гэтай краіне. Безумоўна, гэта стала таксама і актам добрай волі з боку кіраўніцтва Траецкага каледжа Кембрыджскага ўніверсітэта, паколькі лічбавая копія зроблена і перададзена ў Беларусь абсалютна бясплатна, — расказаў **намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Алесь СУША.**

Але ёсць верагоднасць, што налета, падчас святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, мы зможам пабачыць і арыгінал скарынаўскай «Першай кнігі Царстваў» 1518 года. Зараз вядуцца перамовы пра магчымасць і ўмовы атрымання гэтага выдання для часовага экспанавання ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі. Бясспрэчна, гэта стала б адной з важнейшых падзей у культурным жыцці нашай краіны.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*


**Бобруйское управление филиала «Центр «Белтехинвентаризация» оказывает услуги по:**

- оценке имущества (недвижимость, транспорт, оборудование)
- организации и проведению аукционных торгов
- инвентаризации и оценке зеленых насаждений

**ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 28 апреля 2016 г. в 11.00 состоятся ПОВТОРНЫЕ открытые аукционные торги по продаже имущества, принадлежащего на праве собственности БОАО «Лилия» (продавец), в составе:**

**Лот № 1** – изолированное помещение с инв. номером 710/D-79275 (административное помещение) общ. пл. 743,0 кв.м; расположенное по адресу: Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 44-1

**Лот № 2** – изолированное помещение с инв. номером 710/D-79276 (административное помещение), общ. пл. 1378,8 кв.м, инженерные сети: водопровод с инв. ном. 710/С-73702 протяж. – 24,4 м; канализация с инв. ном. 710/С-73702 протяж. – 85,9 м; тепловая сеть с инв. ном. 710/С-73703 протяж. – 64,1 м; ливневая канализация с инв. ном. 710/С-73706 протяж. – 228,8 м, расположенные по адресу: Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 44-2

| | | |
|---|---|---|
| **Продавец предмета торгов** | Бобруйское открытое акционерное общество «Лилия», УНП 700091421 (г. Бобруйск, пер. Революционный, 3, р/с 3012420242010 ЦБУ № 831 ОАО «Белинвестбанк» г. Бобруйска, код 739) | |
| **Организатор торгов** | Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509, ОКПО 55484006, 220034, г. Минск, ул. Чапаева, д. 4, к. 222, р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска, МФО 153001369 | |
| **Место проведения торгов и подачи документов** | ул. Чонгарская, д. 54, г. Бобруйск, в здании Бобруйского управления Филиала «Центр «Белтехинвентаризация» в рабочие дни с 8.30 до 17.30 | |
| **Общие сведения** | **Лот № 1** | **Лот № 2** |
| **Начальная цена продажи без НДС** | 3 368 810 000 рублей | 4 802 917 610 рублей |
| **Шаг аукциона** | 5% | |
| **Размер задатка** | 10% – 336 881 000 рублей | 10% – 480 291 760 рублей |
| **Номер расчетного счета для перечисления задатка** | Получатель платежа – Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509, р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска, код 369 | |
| **Информация о земельном участке** | Для обслуживания продаваемого объекта выделен земельный участок пл. 0,0672 га, что составляет 3444/10000 долей в праве общего долевого постоянного пользования земельным участком пл. 0,1951 га с кадастровым номером 741000000006001085, который предоставлен в общее долевое постоянное пользование БОАО «Лилия» доля в праве – 9836/10000 (0,1919 га) и РУП «Могилевэнерго» доля в праве – 164/10000 (0,0032 га). Правовой режим – право постоянного пользования | Для обслуживания продаваемого объекта выделен земельный участок пл. 0,1247 га, что составляет 6392/10000 долей в праве общего долевого постоянного пользования земельным участком пл. 0,1951 га с кадастровым номером 741000000006001085, который предоставлен в общее долевое постоянное пользование БОАО «Лилия» доля в праве – 9836/10000 (0,1919 га) и РУП «Могилевэнерго» доля в праве – 164/10000 (0,0032 га). Правовой режим – право постоянного пользования |
| **Характеристика предмета торгов** | помещение расп. в 3-этажном кирп. здании, г.п. 1986, перекрытия ж/бет., кровля совмещ. рулон., полы бетон., плитка, имеется: отопл., элетроснабжение, крыльцо | помещение расп. в 3-этажном кирп. здании, г.п. 1986, перекрытия ж/бет., кровля совмещ. рулон., полы бетон., плитка, имеется: отопл., элетроснабжение, крыльцо, мощение: асф. бет. – 361 кв.м и бетон. плиты – 67 кв. |
| **Условия продажи** | 1. При заключении договора купли-продажи между продавцом и покупателем (претендентом на покупку) на цену продажи предмета торгов будет начислен НДС по ставке 20%. 2. В изолированных помещениях сданы в аренду площади – 327,11 кв.м сроком по 01.06.2017 | |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 10 (Десяти) календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов | |
| **Срок и условия оплаты за приобретенное с торгов имущество** | Определяются по согласованию победителя торгов (претендента на покупку) с продавцом при заключении договора купли-продажи | |
| **Срок подачи документов, осмотра предмета торгов и внесения задатка** | По 25 апреля 2016 г. включительно до 16.00 | |

**Победитель (Претендент на покупку)** возмещает затраты на организацию и проведение торгов не позднее 3(трех) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов на основании счета-фактуры, выдаваемой Организатором торгов

**Более подробная информация об условиях участия в торгах, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах, опубликована в газете «Звязда» от 01 декабря 2015 г.

**Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 72-01-32, 72-13-93, 8 (044) 710-50-85 в рабочие дни с 8.30 до 17.30**


■ Інавацыі ў адукацыі

# АД БУДУЧЫХ ПЕДАГОГАЎ ЧАКАЮЦЬ КРЭАТЫВУ

**Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт сумесна з платформай Talaka.by упершыню праводзяць конкурс даследчых стартап-праектаў у сацыяльна-адукацыйнай сферы ў рамках Дэкады студэнцкай навукі.**

Для ўдзелу ў конкурсе неабходна зарэгістравацца на платформе Talaka.by не пазней за 6 красавіка гэтага года і апублікаваць ідэю праекта на той жа платформе з выкарыстаннем пазнакі «БДПУ-стартап» не пазней за 11 красавіка гэтага года.

Прапануюцца наступныя намінацыі: «Найлепшы мультымедыйны стартап», «Найлепшы стартап у электронных навучальных гульнях», «Найлепшы электронны вучэбна-выдавецкі стартап», «Найлепшы метадычны стартап» (па прадметах і галінах ведаў), «Найлепшы навукова-даследчы стартап у галіне адукацыі» (індывідуальны або групавы), «Найлепшы міждысцыплінарны адукацыйны стартап», «Найлепшы стартап сацыяльнай значнасці» і «Найлепшы стартап інклюзіўнай накіраванасці».

Правядзенне трэнінгаў для аўтараў стартап-праектаў будзе праходзіць з 4 красавіка па 22 красавіка. Публічная прэзентацыя праектаў, падвядзенне вынікаў і ўзнагароджанне адбудуцца 25 красавіка.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Сяброўства

# КУЛЬТУРНЫ ВЕКТАР

**У Душанбэ прайшла сустрэча Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Таджыкістане Алега Іванова з міністрам культуры Таджыкістана Шадзібекам Арумбекзада. Бакі абмеркавалі перспектывы беларуска-таджыкскага супрацоўніцтва ў галіне культуры ў найбліжэйшы час. Мяркуецца, што сёлета пройдуць Дні культуры Таджыкістана ў Беларусі.**

Сапраўды, патрэба ў такім шырокім прадстаўленні таджыкскай нацыянальнай культуры даўно наспела. Напрыклад, існуюць проста выдатныя адносіны ў творчых пісьменніцкіх саюзаў Беларусі і Таджыкістана. Велізарную работу ў гэтым плане праводзіць празаік і перакладчык Ато Хамдам у Душанбэ, а ў Беларусі многія ініцыятывы рэалізоўваюцца праз таварыства дружбы «Беларусь — Таджыкістан». Магчыма, следам за Днямі культуры надыдзе і чарга для арганізацыі Дзён таджыкскай літаратуры ў Беларусі. Відавочна, што ўсе магчымасці для гэтага ёсць.

**Кастусь ЛАДУЦЬКА**

# ЗБІРАЕМ АЙЧЫННУЮ СПАДЧЫНУ РАЗАМ

**У красавіку Выдавецкі дом «Звязда» запускае новы інтэрнэт-праект «Спадчына Беларусі» (ён запрацуе па адрасе nasledie.by). Гэта электронная карта, на якой сабраны аб'екты культурна-гістарычнай каштоўнасці краіны. Ажыццёўлены праект пры дапамозе ЮНЕСКА.**

Госць партала займее магчымасць даведацца пра важныя падзеі ў гісторыі Беларусі, выдатных людзей нашай краіны, сучаснае культурнае і навуковае жыццё, пабачыць найпрыгажэйшыя прыродныя аб'екты, пазнаёміцца бліжэй з аўтэнтычнымі абрадамі і рамёствамі.

Матэрыялы «Спадчыны Беларусі» будуць публікавацца на трох мовах: беларускай, рускай і англійскай.

На старонцы кожнага аб'екта з дапамогай інтэрактыўнай яндэкс-карты можна будзе даведацца пра яго месцазнаходжанне. Таксама там будуць змешчаны тэматычныя публікацыі газеты «Звязда» і цікавыя фотарэпартажы.

Запрашаем да супрацоўніцтва ўсіх неабыякавых да беларускай спадчыны людзей. Дасылайце звесткі пра цікавыя аб'екты і іх фотаздымкі на паштовую скрынку праекта — nasledie@zviazda.by.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*